№3 (166)

ПАХОДНЯ

Грамадска-палітычная газета

Люты 2014 г.

КАЛОНКА НАВІН

У краіне

В Беларуси по итогам работы в январе-ноябре 2013 года убыточными были 811 сельхозпредприятий (54,1% от общего их числа) против 455 (30,4% от общего числа) за аналогичный период 2012 года. Об этом сообщает Национальный статистический комитет.

Согласно данным статистики, сумма чистого убытка сельхозпредприятий увеличилась в 4 раза по сравнению с январем-ноябрем 2012 года и достигла 2,3 трлн. рублей.

У Прыдняпроўі

На дорогах Могилевской области в 2014 году установят 24 камеры фотофиксации, сообщил на пресс-конференции, отвечая на вопрос корреспондента БЕЛТА, начальник УГАИ УВД Могилевского облисполкома полковник милиции Михаил Невмержицкий.

643 дорожно-транспортных происшествий зарегистрировано на территории Могилевской области в 2013 году. В них 105 человек погибли, 732 ранены.

У раёне

Белыничское райпо приступает к реализации проекта по строительству нового магазина. Об этом сообщили в управлении инвестиционной и инновационной деятельности комитета экономики Могилевского облисполкома.

Новый торговый объект под брендом «Родны кут» планируют построить по улице Мичурина в районном центре. Это будет магазин смешанной группы товаров, то есть продовольственный с отделом сопутствующих товаров.

Общая площадь торгового объекта составит 700м2, торговая – 550м2. Оснащенный современным торговым оборудованием, он будет работать по принципу самообслуживания. Срок реализации проекта – 22 месяца. Источник финансирования – собственные и заемные средства.

“ЧТО-ТО НЕ ТАК!”

Падчас здымкаў прапагандысцкага фільму «Авель» пра падзеі 19 снежня 2010 года ў Беларусі дзяржаўныя прапагандысты прыдумалі замест лозунга “Жыве Беларусь!”, як яны лічылі, палітычна бяспечны, амаль бяскрыўдны слоган: «Что-то не так!»



Пазней высветлілася, што лозунг у слаўных беларускіх працаўнікоў на ніве ідэалогіі атрымаўся яшчэ той, бо зараз нават вяскоўцы ў нашым далёкім ад сталіцы Бялыніцкім раёне пачалі разумець, што ў нашай краіне ў апошнія гады штосьці творыца ня так.

Пра што казаць, калі нават самыя ідэалагічна правільныя чыноўнікі ўжо даўно не ўзгадваюць лозунг пра “Моцную квітнеючую Беларусь”, які к месцу і не к месцу трындзелі ў год прэзідэнцкіх выбараў 2010 года на кожным кроку. Ды і які ідыёт назаве “моцнай і квітнеючай” краіну, у якой ўсё насельніцтва чакае дэвальвацыі і радуецца, калі кіраўніку гэтай “квітнеючай” краіны ўдаецца выкленчыць чарговы крэдыт, каб яе эканоміка канчаткова не ляснулася.

Праўда, насельніцтва пакуль не задумваецца, што ўсе крэдыты, у рэшце-рэшт, давядзецца аддаваць, і што будзе, калі ўвесь гэты “МММ” скончыцца.

Тады і наступяць сапраўдныя “ягадкі”…

Не спяваюць нашы слаўныя ідэолагі ўжо і цудоўную песенку “Саня остаётся с нами”, якая лілася з дынамікаў усіх прымачоў напярэдадні выбараў 2010 года. Зараз ужо не да песен…

Дайшло тое, што ў Беларусі “штосьці ня так”, і да нашага ненагляднага нязменнага кіраўніка краіны Аляксандра Лукашэнкі.

Лічбы, якія сведчаць пра правал у прамысловасці Беларусі, прывёў сам Аляксандар Лукашэнка на нарадзе па развіцці прамысловага комплекса 4 лютага.

Ён сказаў, што аб’ём вытворчасці знізіўся на 5%. Узрасла знешняя

(Заканчэнне на стар. 8)

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

ПЁТР ШИМБАЛЁВ: «ЧТО ЖЕ ВСЁ-ТАКИ СЛАЩЕ? ХРЕН ИЛИ РЕДЬКА?»

Петра Шимбалёва в Белыничах знают многие. Улыбчивый симпатичный мужчина с небольшой бородкой работает директором в одном из популярных местных магазинов, куда жители Белыничского района довольно часто заходят.



Пётр Шимбалёв

Тем более, что многим людям из старшего поколения белыничан фамилия Шимбалёвых очень хорошо знакома. Отец Петра Шимбалёва, Василий Шимбалёв, не один год являлся членом Белыничского райисполкома, определённое время возглавляв сельскохозяйственную отрасль Белыничского района, отдел охраны природы, пользовался заслуженным авторитетом и уважением у местных жителей.

И всё же Пётр Шимбалёв стал известен многим белыничанам (и не только) благодаря своей активной позиции по отстаиванию интересов многодетных семей при строительстве дома для них в городском посёлке. Члены ПЖСК «Двенадцать», который был организован для строительства дома для многодетных семей в Белыничах, избрали Петра Шимбалёва председателем жилищно-строительного кооператива. Многодетным семьям из Белынич пришлось пройти множество самых разных инстанций, чтобы получить жильё в новом доме по приемлемым для них ценам. И добиться успеха они смогли во многом благодаря активной позиции в отстаивании своих прав, и хорошим лидерским и организаторским качествам председателя ПЖСК «Двенадцать» Петра Шимбалёва.

Не так давно журналисты «Паходні" узнали, что общественный активист собирается принять участие в выборах депутатов местных Советов в качестве кандидата в депутаты, это его принципиальное решение. Пётр Шимбалёв верит в то, что, став депутатом Белыничского районного Совета и Могилёвского областного Совета депутатов, он сможет защищать интересы своих земляков на более высоком уровне.

Корреспондент нашей газеты задал несколько вопросов Петру Шимбалёву, чтобы выяснить, почему именно активист решил принять участие в местных выборах.

- Пётр Васильевич, было бы неплохо, если бы в начале несколько слов рассказали о себе и своей биографии. Думаю, это будет интересно читателям «Паходні».

- Родился я 12 июля 1971 года в городе Славгороде Могилёвской области, именно там тогда работал отец и жила вся наша семья. В 1977 году отца перевели на новую должность в Белыничский район, и мы всей семьёй переехали в городской посёлок, который стал для меня по-настоящему родным. Здесь я провёл всё своё детство и юность, окончил школу. В 1989 году я был призван на службу в ряды Советской Армии. Отслужив в рядах вооружённых сил, уехал в Москву, в период с 1992 по 1996 год учился там в Московском Теологическом Институте.

После окончания института довелось поработать определённое время в среднеазиатских странах – Узбекистане и Кыргызстане. Был миссионером, читал лекции, работал заместителем директора Библейского Колледжа «Шелковый Путь» в Бишкеке, занимал должность президента Ассоциации христианских школ Кыргызстана.

Кстати, со своей будущей женой познакомился в Ташкенте, в 1997 году.

По приглашению «Христианской Епископальной Церкви» в начале 2005 года уехал в Соединённые Штаты Америки и определенноё время работал там. Вернулся в Ташкент в 2007 году, ведь там по-прежнему оставались мои жена и дети. Весной 2008 года мы вернулись в родную Беларусь, в Белыничи. Какое-то время, что бы прокормить семью, подрабатывал на стройке, а также иногда, по приглашению, читал лекции в Сибири и на Дальнем Востоке.

С 2011 года работаю директором ЧТУП «РУ-БОН – М-28». Женат, в нашей семье трое детей – мальчик и две девочки.

- Пётр Васильевич, почему вы всё-таки решили участвовать в выборах депутатов местных Советов в качестве кандидата? Не секрет, что многие простые люди считают, что выборов в нашей стране уже давно нет?

- Будучи председателем ПЖСК «Двенадцать» мне довелось отстаивать права многодетных семей на действительно льготное жильё. В течение полугода я стучал во многие двери кабинетов местных чиновников, ища помощи и взаимопонимания, но мне только и говорили, что «мы не можем решить возникшие у вас проблемы, ваша ситуация безвыходная». Тогда я подумал, а что, если обратиться к местным депутатам, ведь мы их для этого и выбирали. К своему удивлению я обнаружил, что чиновники и депутаты – это всё те же лица. Естественно, как они мне могли помочь по депутатской линии, если по чиновничьей они меня уже отправили туда, где «Макар гусей не пас».

И только после многих звонков и написанных писем, когда наши проблемы стали известны

(Продолжение на стр. 3)

ПЁТР ШИМБАЛЁВ: «ЧТО ЖЕ ВСЁ-ТАКИ СЛАЩЕ? ХРЕН ИЛИ РЕДЬКА?»

(Продолжение. Нач. на стр. 2)

руководителю Государства, только тогда все изменилось. В том числе и отношение со стороны чиновников и депутатов.

Так быть не должно. Ведь у нас есть депутаты в районном Совете, есть депутаты и в областном, не говоря уже о тех депутатах, которые должны представлять наши интересы в столице.

Помнят ли они о нас? Помним ли мы, кого выбирали 4 года назад? Что они сделали для всех нас из того, что пообещали перед выборами?

Видя такое положение вещей, и на личном опыте испытав его пагубность для обычного гражданина, в моем сердце появилось желание выдвинуть свою кандидатуру на предстоящих выборах депутатов местных Советов. Ведь, что бы быть депутатом, не обязательно быть начальником или бывшим начальником, нужно просто иметь сострадание к людям, вникать в их проблемы и иметь большое желание им помогать.

- Что лично Вы ждёте от предстоящих выборов и на что надеетесь?

- Скоро выборы. Скоро придется выбирать. В очередной раз нам придется ответить, прежде всего, самим себе: Что же всё-таки слаще? Хрен или редька?

Что я имею ввиду? Попробую объяснить.

Если человек уже является чиновником или облечен властью, но не хочет или не может помогать людям, а все время пытается объяснить, почему жить лучше пока еще нельзя, и почему проблема, с которой обращаются граждане, не может быть решена в ближайшее время, и что нужно ждать с моря погоды, то неужели этот же самый человек должен идти в депутаты, чтобы иметь дополнительные возможности для помощи людям? Уверен, что нет. Если, занимая должность и имея возможности делать доброе, ты этого не делаешь, как, став депутатом, ты пойдешь против себя самого?



Моё глубокое убеждение – депутатом должен быть только тот человек, который действительно стремится помогать людям.

- По Вашему мнению, какими должны быть предстоящие выборы депутатов местных Советов?

- В идеале, выборы должны быть честными. Избранники должны быть действительно народными.

Ведь если кто-то под покровом ночи совершает подмену бюллетеней и на утро их стараниями кто-то становится новоиспеченным депутатом, то, конечно, прежде всего, этот «депутат» будет в долгу у тех, чьими стараниями он победил.

Как будет на предстоящих выборах, я не знаю, скажу только одно - «Есть Бог на Небе, Который Видит все, что происходит на Земле».

- Пётр Васильевич, что Вы лично планируете сделать в первую очередь, став депутатом районного и областного Советов?

Я иду на выборы не только с одним желание стать депутатом. У меня есть конкретные цели, которые я постараюсь воплотить в жизнь.

В первую очередь я буду добиваться для родных Белынич строительства супермаркета или торгово-развлекательного центра.

По моему глубокому убеждению, цены на продукты питания должны быть снижены, ведь мы зарабатываем меньше и не можем позволить себе платить больше, чем жители областного города или столицы. Сейчас многие белыничане ездят за покупками в Круглое или Могилев, неужели мы не достойны тех же благ, что и жители этих населённых пунктов?

Сразу же попытаюсь найти ответ на вопрос, почему только у нас в Белыничах так плохо пахнут отстойники?

С детства я испытываю дискомфорт от этого зловонного запаха и стыд, когда приезжие люди говорят «ну у вас и воняет». Мне уже 42 года, неужели нужно прожить ещё сто лет, что бы дождаться решения этой проблемы?

Также постараюсь решить вопрос с периодическим спуском воды на плотине в Тетерино, из-за чего гибнет родная река Друть. Конечно, можно ловить одного человека с удочкой во время нереста и выписывать ему штраф, но, когда после нереста резко падает уровень воды и миллионы икринок засыхают на берегу, так и не став рыбами, штрафовать почему-то некого?

Буду настаивать на том, что бы в родном Белыничском районе в

(Окончание на стр. 5)

АБ НЕПРАФЕСІЙНАЙ БАЛБАТНІ І ПАЛІТЫЦЫ Ў СФЕРЫ ЖКГ

"Слишком много здесь непрофессиональной болтовни и политики", — адрэагаваў Аляксандр Лукашэнка на пытанне генеральнага дырэктара Беларускага тэлеграфнага агенства Дзмітрыя Жука аб перспектывах удасканалення ЖКГ і яе тарыфнай палітыцы.

Пытанне прагучала падчас сустрэчы з кіраўнікамі буйнейшых беларускіх СМІ 21 студзеня.

"А факты таковы, что у нас сегодня семья из трех человек — двое работают, двухкомнатная квартира — от доходов семьи платит сколько бы вы думали? Три процента... Двое бюджетников работают и третий неработающий — четыре процента. Пенсионеры чуть больше пяти процентов — это двое пенсионеров в двухкомнатной квартире. От их доходов всего пять процентов", — распавёў Лукашэнка журналістам.



Як дасягненне дзяржаўнай палітыкі, як праяўленне "клопату" дзяржавы аб сваіх грамадзянах адзначыў ён і той факт, што 77% сабекошту паслугаў ЖКГ, што аказваюцца насельніцтву, пакрываюцца за кошт дзяржаўнага бюджэту. А беларускія грамадзяне аплочваюць толькі 23% ад сабекошту, што ў сумарным выглядзе як мінімум у тры разы ніжэй за краіны Еўропы. І калі б у Беларусі кошты за паслугі ЖКГ былі адпушчаны па рыначнаму шляху, то прыйшлося бы ўздымаць кошты і за смецце, і за электраэнэргію, і за ўсё астатняе.

Робячы падобныя заявы, беларускія ўлады звычайна прапускаюць той момант, што і гэтыя 77% сродкаў таксама ўзяты імі з кішэняў беларускіх грамадзян у выглядзе розных выплат і падаткаў у бюджэт, якія ўвесь час узрастаюць.

Стрымліванне коштаў камунальных паслугаў для насельніцтва Аляксандр Рыгоравіч паставіў сабе ў асабістую заслугу. І ў той жа час выказаў цалкам супярэчлівыя раней сказанаму меркаванні, што ў плане тарыфаў у нас загадкавая краіна: "Сколько раз я правительству поручал: дайте мне реальные затраты на вывоз мусора, на воду, тепло и прочее. Дайте мне реальную цену, подсчитайте, пройдите по всем этапам и ступенькам, чтобы я видел, сколько же реально стоит киловатт/час, сколько стоит гигакалория тепла и прочее. Дайте мне это…".

Дык аб якім жа "клопаце", аб якіх "заслугах" можа ісці гаворка, калі амаль за 20 год прэзідэнцтва Лукашэнка так і не змог дабіцца ад беларускага ўрада рэальных дадзеных па сабекошту камунальных паслугаў?

Аб якім жа павышэнні коштаў можа ісці гаворка, калі, напрыклад, вываз смецця ў 2013 годзе насельніцтва краіны ўжо аплочвала ў 103% ад рэальнага сабекошту затрат?

І ў чым сэнс выказванняў "о непрофессиональной болтовне и политике", калі яшчэ ў красавіку 2013 года, даручаючы старшыні КДК А.Якабсону разабрацца з парадкам фармавання сабекошту паслугаў ЖКГ, кіраўнік дзяржавы сцвярджаў, што насельніцтва ўжо зараз аплочвае больш за 60% затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслугаў?

Спекулюючы на нізкіх памерах аплат беларусаў за камунальныя паслугі ў параўнанні з грамадзянамі іншых краін, беларускае кіраўніцтва імкнецца навязаць грамадзянам сваёй краіны меркаванне, што дзвюхпакаёўка для сям'і з трох чалавек — гэта найвялікшае дасягненне, загнаць людзей у нарматывы 10-15 кв. м жылля на чалавека. Пры гэтым беларускімі ўладамі ўсяляк замоўчваецца, што такія нарматывы ў краінах Еўропы вагаюцца ад 40 да 60 кв. м на аднаго чалавека, а ў ЗША — 70 кв. м, пры значна вышэйшым узроўні якасці камунальных паслугаў.

У апошнія дзесяцігоддзі ў Беларусі назіраецца цікавая тэндэнцыя. Як толькі ў найвышэйшых эшалонах улады распачынаецца гаворка аб дасягненнях у стрымліванні тарыфаў за камунальныя паслугі, то гэта значыць, што ў бліжэйшы час неабходна чакаць павышэння коштаў паслуг ЖКГ для насельніцтва.

Так было, напрыклад, у 2000-2005 гадах, калі рост тарыфаў для насельніцтва на жыллёва-камунальныя паслугі яўна апярэджваў агульны паказчык інфляцыі. Пры росце спажывецкіх коштаў за 2000-2005 гады ў 6,1 раза, тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі, уключаючы электра- і газазабеспячэнне, павялічыліся ў 50,7 раза. Найбольш хуткімі тэмпамі раслі тарыфы на ацяпленне, тэхнічнае абслугоўванне жылфонда, электразабеспячэнне.

Але ў выніку ўзровень пакрыцця плацяжамі насельніцтва страт на прадастаўленыя жыллёва-камунальных паслугаў, акрамя электра- і

(Заканчэнне на стар. 5)

"Бабушкіна крынка" вырабляе смятану з какосавых эмульгатараў і пальмавага масла

Гэтыя экзатычныя кампаненты каштуюць куды танней за натуральныя.

Калі праглядзець склад 26%-най смятаны, то можна ўбачыць, што яна вырабляецца са слівак кароўега малака, малака абястлушчанага і шэрагу замяняльнікаў у агульнай колькасці 14 штук.

Некалькі год назад "Бабушкіна крынка" істотна ўзвысіла кошты на малако – яна пачала дабаўляць у яго розныя дабаўкі- кальцый і іншыя элементы. Спецыялісты падлічылі, што кошт дабавак у малако зусім не цягне на павелічэнне яго кошту амаль у два разы. Дзякуючы такому новаўвядзенню з прылаўкаў канчаткова знікла так званае сацыяльнае малако.

Дырэктар прадпрыемства па вырабу малочнай прадукцыі Ігар Кананчук раней паведамляў, што падвышэнне коштаў на малочную прадукцыю дазволіла выйсці на рэнтабельнасць прадпрыемства.

Якуб Корсак, "Наш Магілёў"

АБ НЕПРАФЕСІЙНАЙ БАЛБАТНІ І ПАЛІТЫЦЫ Ў СФЕРЫ ЖКГ

(Заканч. Пачатак на стар. 4)

газазабеспячэння, для стандартнай дзвюхпакаёўкі, згодна статыстычных дадзеных, узрос з 12% у 2000 годзе толькі чамусці да 42,4% у 2005-м.

Доля жыллёва-камунальных паслугаў у спажывецкіх расходах насельніцтва за гэты час узрасла з 3% да 9,1%.

Так было і ў 2006-2010 гадах, калі кошты зноўку ўзраслі ў дзесяткі разоў.

Так будзе гучаць гэтая старая песня, але на новы лад, і ў гэтай пяцігодцы, бо, як нам зноўку кажуць беларускія ўлады, насельніцтва краіны аплочвае ўсяго толькі 23% сабекошту камунальных паслугаў, і доля гэтых паслугаў у спажывецкіх расходах зноўку вярнулася на лічбу "тры".

Рыгор КАСТУСЁЎ

КРАЖА В МОЩАНИЦЕ

30 января Белыничским районным отделом Следственного комитета возбуждено уголовное дело по ст. 205 ч. 2 УК (Кража) в отношении неработающего, ранее судимого жителя д. Заполье, 1991 г.р., который 25 января в агрогородке Большая Мощаница из сарая местной жительницы, 1953 г.р., путем свободного доступа похитил 23 секции чугунных отопительных радиаторов. Раскрыто следственно-оперативной группой. Похищенное изъято.

Воруют всё даже у своих земляков, совести у этих людей нет...

ПЁТР ШИМБАЛЁВ: «ЧТО ЖЕ ВСЁ-ТАКИ СЛАЩЕ? ХРЕН ИЛИ РЕДЬКА?»

(Окончание. Нач. на стр. 2-3)

сельской местности появилось больше банкоматов и торговых терминалов для расчета по банковским карточкам в сельских магазинах.

Подниму вопрос о снижении торговых наценок в автолавках. Не секрет, что цены на продукты в автомагазинах райпо значительно выше чем, у предпринимателей. Чем же сельчане, зарплата и пенсия которых оставляет желать лучшего, хуже жителей городов?

Планирую добиваться улучшения качества дорог в Белыничском районе, должного освещения улиц сельских населённых пунктов и регулярной их очистки от снега в зимний период года.

Это далеко не все цели, которые я ставлю перед собой на предстоящие годы. Но, самое главное, я всегда буду рядом со своими избирателями, и вы всегда сможете обратиться ко мне за помощью.

Я вас не подведу.

- Спасибо за интересную и содержательную беседу, Пётр Васильевич.

Что ж, Пётр Шимбалёв верит в то, что справедливость в нашей стране ещё возможна. Пожелаем ему успехов в его дальнейшей общественной деятельности.

Интервью провёл Иван Борисов

ОЧЕРЕДНОЕ УБИЙСТВО В БЕЛЫНИЧАХ

Преступление с тяжкими последствиями случилось 27 января в г.п. Белыничи.

27 января в УЗ «Белыничская ЦРБ» с проникающими ножевыми ранениями от дома по улице Энгельса в г.п. Белыничи бригадой СМП доставлен и госпитализирован неработающий местный житель, 1987 г.р. УИМ установлено, что 27 января около 19-15 в указанном месте телесные повреждения, находясь в состоянии алкогольного опьянения, в ссоре ножом причинил житель г.п. Белыничи, 1977 г.р. Задержан в порядке ст. 108 УПК. 28 января Белыничским районным отделом Следственного комитета возбуждено уголовное дело по ч.1 ст. 14, по ст. 139 ч.1 УК (Убийство), сообщает интернет-сайт УВД Могилёвского облисполкома.

Виктория Белова

ВОСЬ ТАКІЯ ДЭПУТАТЫ



Дэпутат прапануе хаця б сімвалічна плаціць за наведванне паліклінік. З такой ініцыятывай выступіў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Дзмітрый Шаўцоў.

Ён падтрымаў колішняе выказванне віцэ-прэм'ера Анатоля Тозіка, які лічыць, што грамадзяне павінны прымаць удзел у аплаце свайго лячэння.

Паводле Шаўцова, "бясплатная медыцына" каштуе для беларускай дзяржавы "вялізных грошай". Таму варта разгледзіць варыянт "хаця б сімвалічнай платы". І, як высвятляецца, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў гатовыя да ўнясення адпаведных паправак у заканадаўства, калі такая патрэба ўзнікне, заявіў Дзмітрый Шаўцоў у эфіры праграмы "Контуры" тэлеканала АНТ.

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

МАРАЗМАТЫКАМІ НАРАДЖАЮЦЦА ЦІ МАРАЗМАТЫКАМІ СТАНОВЯЦЦА?

Нікому не навязваў і не імкнуся навязваць свой пункт гледжання па любому пытанню. Але выказаць яго ў тым ці іншым свеце, мяркую, іншы раз проста неабходна. Для сябе самога, хаця б. Каб выпусціць, як зараз "модна" казаць, пару ў свісток.



Наогул, іншым разам як задумаешся, дык такое адчуванне наплывае, нібыта упіраешся ілбом ня тое што ў сценку, а ў піраміду Хеопса. І тады ўжо бясспрэчна пагаджаешся са словамі, якія японцы сказалі яшчэ паўсотню год таму, гэта значыць – уклалі свае словы ў маю яшчэ юнацкую галаву. Яшчэ у савецкія часы яны прамовілі: "Вы адсталі ў сваім развіцці назаўжды". Гэта азначала і азачае, што працэс, распачаты Уладзімірам Ульянавым, НЕЗВАРОТНЫ…

Зараз ведаю, пастаяныя чытачы нашай газеты са мною пагодзяцца наконт вышэйсказанага. Нават на ўсе сто адсоткаў. У люмпен-пралетарыята, ды ў тых людзей, якія чытаюць толькі "правільныя" газеты, ад гэтых слоў вочы на лоб палезуць. Як лезлі яны ў іх і ў 90-я гады. А шмат яшчэ ў каго – і зараз. Бо яшчэ за гэты перыяд, за гэтыя два дзесяткі гадоў панавання дыктатуры, мы не змаглі пазбавіцца халопства. Не змаглі выціснуць з сябе ніводнай каплі раба. Пішу, бо ведаю, што гэта праўда. У 1990-я гады за мае "няправільныя" погляды, як казалі мне мае сябры, шмат хто змяніў да мяне сваё стаўленне. Як не дзіўна, гэта былі, менавіта, шэраговыя працаўнікі, мясцовая інтэлігенцыя. Хаця, трэба аддаць належнае, што вельмі паказальна, кіраўнікі прадпрыемстваў, чыноўнікі з райвыканкаму, нават старшыні заўжды не саромеліся здаровацца са мною дэманстратыўна за руку. Выснова: адукаваныя людзі ўсё разумелі і разумеюць. А простыя - як былі шаўкамі, так імі і засталіся…

А напісаць гэтую нататку мяне падштурхнула выказванне намесніка прэм'ер-міністра Анатоля Тозіка. Яму, бачыце, не падабаецца, што беларусы мала усміхаюцца.

"У нас менталитет такой, когда делают лицо страшнее смерти. Что стоит друг другу улыбнуться? Но у нас, если ты улыбнулся, возникают совсем другие ассоциации". Якія асацыяцыі меў на ўвазе Тозік, ён не патлумачыў. Але мяне асабіста гэта занадта і не цікавіць. Мяне закранула іншае. А менавіта: зацягнулі на шыі народа пятлю, і яшчэ хочуць, каб народ усміхаўся. Ну, ці ж гэта не маразм? Ці ж гэта не ідыятызм? Ці ж гэта не мярзотнасць? Чалавеку прадыхнуць не даюць магчымасці, а ён яшчэ павінен "скаліць зубы". Каму? Тозіку? …

Тут нават вожыку зразумела, што для таго, каб людзі ўсміхаліся, трэба стварыць для іх адпаведныя жыццёвыя ўмовы. Хаця б даць магчымасць у сваёй краіне працаўладкавацца і зарабляць (не падачку атрымліваць) нармальныя грошы…

На Мінскім трактарным заводзе некаторым катэгорыям работнікаў зменшылі зарплату. Настаўнікам "дабавілі" зарплату так, што некаторыя педработнікі, улічваючы ўзросшую нагрузку, у пераліку сталі атрымліваць нават менш ранейшага. Аўтамабільнае паліва за год даражэла некалькі разоў. Медыкаў "оптимизировали" так, што ня толькі на перыферыі не хапае ўрачоў, але нават і ў сталіцы. У пачатку (!) снежня патэлефанавала мая знаёмая з Мінска. Захварэла бранхітам, размаўляць ня можа – кашаль забівае. Пайшла ў паліклініку, каб узяць талон да ўрача, а ёй прапанавалі толькі на 31 бягучага месяца. Скончылася тым, што прыйшлося выбываць тэрмінова "хуткую". Да сёняшняга дня ня могуць вылечыць. Можна "усміхацца"?...

Пастановай урада №569 урэзалі выплаты па бальнічных лістах, што асабліва моцна ўдарыла па маладых спецыялістах, у якіх перыяд уплаты страхавых унёскаў складае менш шасці месяцаў. Трэба смяяцца?...

Каб ад бязглузднага кіравання краінай зацыраваць дзяржаўны бюджэт, на якія толькі хітрыкі не ідуць эрзацкіраўнікі. Прыдумалі, каб аўтааматары плацілі падатак за ўдзел у дарожным руху. Хаця гэты падатак закладзены ў аўтамабільнае паліва. Атрымліваецца, каб сесці за "баранку" аўто, трэба двойчы заплаціць грошыкі дзяржаве. А куды яны пойдуць, ніхто за гэта справаздачу трымаць , як заўжды, не збіраецца. Хто ж перад халопамі справаздачу трымае?! Такім

(Заканчэнне на стар. 7)

МАРАЗМАТЫКАМІ НАРАДЖАЮЦЦА ЦІ МАРАЗМАТЫКАМІ СТАНОВЯЦЦА?

(Заканч. Пачатак на стар. 6)

Такім чынам можна дайсці і да таго, што хутка будзем плаціць падатак і за ўдзел у пешаходным руху… А мо і за паветра, якім мы карыстаемся паўсядзённа. Вось тут будзем рагатаць! …

Навукоўцы з універсітэтаў горада Уорык (Вялікабрытанія) і штата Міннесота (США) прыйшлі да высновы, што найбольш стабільнымі дзяржавамі сучаснага індустрыяльнага свету з'яўляюцца тыя, дзе гадавы даход на душу насельніцтва дасягае 35, 5 тысячаў долараў. У нас са студзеня 2013 года мінімальная заработная плата была ўстаноўлена урадам (у нас зарплата не зарабляецца, а ўстанаўліваецца.- Аўт) у памеры адзін мільён трыста дзевяноста пяць тысячаў рублей. З улікам індэксацыі месячная мінімальная зарплата за лістапад сёлетняга году склала Br1 млн. 466 тыс. 230, што па сёняшняму курсу складае каля ста сарака сямі даляраў. Ёсць з чым параўнаць? Зато мінімальная заработная плата з 1 студзеня 2014 году падвысілась і складзе яна аж… Br1 млн. 660 тыс.. Вось разбагацеем! А на колькі прыступак страціць сваю вартасць рубель – вялікае пытанне… Гэтаксама пасмяемся. Хутчэй – са слёзамі…

У нашай краіне існуюць паўсядзённыя парушэнні працоўных правоў грамадзянаў. Захацеў працадаўца – зволіў чалавека з працы. Не спадабалася "фізіяномія" - на працу не ўладкавалі. Не своечасова сталі выплочваць зарплату. Ёсць выпадкі, дзе замест заработаных грошай зарплату выдаюць натурай: сенам, навозам ды іншым. Я ўжо не пішу аб кантрактах, пры дапамозе якіх людзей скавалі кайданамі. Вельмі смешна!...

Нядаўна пазваніла сваячка з Мінска. Хацела зрабіць сабе падарунак да навагодніх святаў: купіць добрыя духі. Увесь Мінск абскакала і ўсюды толькі, як яна сказала, кітайская ванючка. Дробязь. Праўда? А для жанчыны гэта, можа, было сэнсам сёняшняга дня. Справа тут яшчэ і ў тым, што з такіх дробязяў у нас складаецца ўсё жыццё. І зусім ня смешна! …

Пра жыццё правінцыйнае дык і гамонку весці балюча.Тутачкі куды ня ткні пальцам, усюды праблемы. Пра іх ужо і пісаць ніякавата. І галоўная з іх – для людзей няма працы, недзе прыкласці рукі, каб зарабіць для сям'і грошай. Таму і едуць на заробкі за мяжу. Адтуль прывозяць іх целы ў трунах. Вось і нядаўна пахавалі трох жыхароў Чэрыкаўскага раёна, якія паехалі ў шасцярох ў Расію з мэтаю палепшыць сямейны бюджэт. У выніку тры чалавекі загінула, а трое іх таварышаў ляжаць у рэанімацыі. Да сёняшняга дня іх лёс мне не вядомы. І як у такіх умовах існаваць семьм загінулых? І хто за гэта адкажа? Што, і тут смяяцца?...



Нас вялі "правільным " курсам, мы "квітнелі" і так "расквітнелі", што далей ужо некуды. Вось тут, сапраўды, смешна…

Паглядзеўшы на кошт клубнікі на Камароўскім рынку Мінска, цэннікі якой паказваюць 140 тысяч рублёў за кіло, ня толькі ўсміхнешся, а нават зарагочаш… шалёным рогатам. Але ўсё пазнаецца ў параўнанні. Для большай часткі нашых грамадзянаў, асбліва для пенсіянераў (пра калгаснікаў дык увогуле гамонкі няма), сто сорак тысячаў нашых "драўляных" – гэта грошы. Для прэм'ераў, віцэ-прэм'ераў ды іншага рангу чыноўнікаў 140 тысяч бел. рэ.– гэта дробязь. Рагачы, народ!…

Такім чынам не зразумела, каму і чаму людзі павінны ўсміхацца. Мо таму самаму Тозіку. Хацелася б паглядзець, як усміхаўся б сам Анатоль, калі б ён апынуўся на месцы шэраговага грамадзяніна!!! Мо тады ён паведаміў бы пра свае "ассоциации", якія ім апанавалі б. А мне пакуль сёняшняе жыццё напамінае карцінку, калі чалавека паставілі на падстаўку с пятлёю на шыі і яму кажуць пра сэнс жыцця, пра тое, як цікава жыць і як добра жыць, калі жывеш добра й багата, а потым выбіваюць падстаўку з-пад ног. Але добра, што яшчэ не звязалі рукі. І чалавек, учапіўшыся за пятлю, імкнецца яе расцягнуць, боўтаючы нагамі…

Карацей, нягледзячы на хрэновае жыццё, беларус, як мяркуе Анатоль Тозік, ўсё роўна павінен усміхацца. Таму, мяркую, трэба тэрмінова прыняць дэкрэт з патрабаваннем да людзей, каб яны ўвесь час "зубы скалілі". Бо да чэмпіянату трэба ж яшчэ патрэніравацца і прызвычаіцца та таго, каб рот не зачыняўся ні на хвіліну.

Абурыла віцэ-прэм'ра і тое, што музеі рана скончваюць сваю працу: "Что это такое, когда музей работает с 9 до 18? Мне что, с работы в три уходить, чтобы попасть туда? За неделю до начала чемпионата мира и ещё неделю после его завершения они должны работать круглосуточно!"

Ён прапанаваў, каб у час турніра пастаянна дзейнічала акцыя "Ночь музеев", перамяшчаючыся з аднаго музея ў другі.

Вось так і жывём! Дакладней – існуём. Для паказухі - замежнікам. На радасць… чыноўнікам. А пра свой народ… А яго для нашых чыноўнікаў не існуе!

Сямён Панізоўцаў

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

“ЧТО-ТО НЕ ТАК!”

(Заканчэнне. Пач. на стар. 1)

дэбіторская запазычанасць, даўгі за неаплачаную прадукцыю дасягнулі 118 трыльёнаў рублёў, што больш за два сярэднямесячныя аб’ёмы вытворчасці. Чысты прыбытак прамысловых прадпрыемстваў скараціўся амаль удвая, 17% прадпрыемстваў ужо стратныя, а сумарныя чыстыя страты дасягнулі 4,5 трыльёна.

«Гэта сапраўды страшныя лічбы, — пракаментаваў “Радыё “Свабода” былы генэральны дырэктар „Амкадора“ Васіль Шлындзікаў. — І гэта заканамерны вынік эканамічнай палітыкі дзяржавы. Вакол нас рынкавая эканоміка. А там дзейнічаюць свае законы, якія не падпарадкоўваюцца ўказам беларускага кіраўніка. Ігнараванне рынкавых законаў і даводзіць да гэтага.

Амаль кожнае пятае прадпрыемства вырабляе толькі... дым. І праядае тое, што раней назапасілі. Лепей бы яны наагул не працавалі. Лепей бы іх у Сочы накіраваць. І няхай там адпачываюць на беразе. Карысці для эканомікі было б болей».

Як кажуць, няма чаго дадаць, дакіраваліся нашы слаўныя кіраўнікі за 20 з лішкам гадоў. Каб чытачы “Паходні” зразумелі, у якім “росквіце” знаходзіцца наша слаўная краіна, прывяду яшчэ адну цытату з нарады ў кіраўніка дзяржавы 4 лютага, якую сказаў віцэ-прэм’ер Пётр Пракаповіч Аляксандру Лукашэнка.

«Аляксандр Рыгоравіч, трэба ж быць рэалістамі - у нас няма ніводнага машынабудаўнічага прадпрыемства, якое было б канкурэнтаздольнае з сусветнымі лідарамі. Для таго, каб МАЗ і Трактарны завод былі канкурэнтназдольнымі, трэба яшчэ ўкласці мільярды і сотні мільёнаў. Гэта ж сёння наша рэальнасць», - заявіў Пётр Пракаповіч у адказ на крытыку Лукашэнкі наконт затаварасці складоў беларускіх прадпрыемстваў.

Аказваецца, толькі на нарадзе высветлілася, што ў краіне наогул няма канкурэнтаздольных прадпрыемстваў. Відаць, кіравалі ёй усе гэтыя гады праклятыя БНФаўцы, а не Аляксандр Рыгоравіч сумесна з Героем Беларусі Пятром Пракаповічам і аддпанымі паплечнікамі-чыноўнікамі.

І гэта гэтыя праклятыя найміты злосных буржуінаў “пратрахівалі” усе грошы на новыя палацы і самалёты для сябе, любімых, на праваленую мадэрнізацыю і лядовыя палацы, на навядзенне “паказухі” і “ідэалагічную вертыкаль”. Гэта свалачугі з пятай калоны дабівалі да абуха беларускія прадпрыемствы, не пабудаваўшы за дваццаць з лішнім год амаль нічога новага.

Не, штосьці тут не так, рабілі гэта якраз нашы слаўныя чыноўнікі разам з сваім нязменным лідарам…

Не буду пакуль шмат спыняцца на сітуацыі ў нашым Бялыніцкім раёне, гэта будзе тэма для іншага артыкула. Аднак нашы паважаныя чытачы самі ведаюць, што пасля атрымання “багатага ўраджаю” мінулай восенню, ужо зараз у бальшыні гаспадарак няма канцэнтратаў, каб карміць жывёлу. Кіраўніцтва прамысловых будаўнічых арганізацый раёна думае пра тое, як знайсці грошы на заробкі сваім працаўнікам, ідуць размовы пра скарачэнні штатаў. Магу адзначна сцвярджаць, што ў бліжэйшы час сітуацыя будзе толькі пагаршацца.

“Что-то не так”, лепш і не скажаш…

Іван Барысаў



ВОРУЮТ ВСЁ

27 января Следственным комитетом возбуждено уголовное дело по ст. 205 ч. 2 УК (Кража) в отношении ранее судимого жителя г.п. Белыничи, 1994 г.р., который 5 января в а.г. Вишов в квартире знакомого из кармана куртки неработающего местного жителя, 1993 г.р., похитил 5 000 руб. ЦБ РФ. Задержан в порядке ст. 108 УПК. Раскрыто ОДО, сообщает uvd.mogilev.by.

Анекдот дня

Если вам кажется, что государство вас постоянно обманывает, не сомневайтесь – это вам не кажется!

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем выдаўца газеты.

Адрас рэдакцыі: 213173, Бялыніцкі раён, аг-к Вялікая Машчаніца, вул. Савецкая, д. 4. Тэл. 8 (02232) 37-365. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Наклад 299 асобнікаў. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 06.02. 2014 г. у 11-00.